Источник: "Родная прырода" - №2, 2019-02-15





Фота Віктара КАЗЛОЎСКАГА

**Адна з асноўных характарыстык папуляцыі жывёл — іх колькасць. Чым яна вышэйшая, тым большыя шанцы, што прадстаўнікі віду змогуць выжыць у складаных умовах, створаных як самой прыродай, так і чалавекам. Гэта тычыцца ўсіх прадстаўнікоў беларускай фаўны, нават волатаў нашых лясоў — ласёў.**

# Рагаты, вялікі, а не зубр...

## Яшчэ адзін уладар нашых лясоў рассяліўся па ўсёй краіне

### Крыху гісторыі

У канцы XVIII-пачатку XIX ст. еўрапейскі лось сустракаўся па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Найбольшая колькасць жывёл была сканцэнтравана на Палессі і ў Паазер'і. Але ўжо ў пачатку XX стагоддзя лось стаў выключна рэдкім відам, знаходзіўся на мяжы поўнага знішчэння. Разбурэнні, якія прынеслі на нашы землі Першая сусветная вайна і рэвалюцыя, сталі цяжкім выпрабаваннем для народа. Умовы таго часу вымусілі людзей шукаць харчаванне ў лесе, здабываць дзічыну. На жывёл (асабліва буйных) актыўна вялося дазволенае паляванне, але квітнела і браканьерства. У выніку, паводле даных на верасень 1927 года, у Беларусі налічвалася каля 150 ласёў, у 1936 годзе іх было ўсяго каля 380. Негатыўна адбіліся на колькасці папуляцыі і Вялікая Айчынная вайна, і цяжкі пасляваенны перыяд. Падчас вайны масава высякаліся лясы, але пасля яе заканчэння ў нашай краіне пачаліся інтэнсіўныя лесапасадкі. Праз 30 гадоў (у 1975-м) малады лес стаў выдатнай кармавой базай для лася, папуляцыя пачала хутка расці.

Дэпрэсія папуляцыі гэтага прадстаўніка сямейства Аленевыя ўзнікла ў пачатку 1990-х гадоў і працягвалася да 1997 года. У гэты час у сувязі з палітычнымі падзеямі актывізавалася браканьерства. Папуляцыі не толькі лася, але і іншых буйных капытных панеслі вялікія страты: браканьеры часта забівалі дарослых жывёл, а маладняк (цяляты, нованароджаныя) гінуў з-за драпежнікаў. З 1998 года ўжо назіраўся паступовы прырост іх колькасці. Актывізавалася ахова жывёльнага свету, паляўнічыя гаспадаркі праводзілі біятэхнічныя мерапрыемствы (падкормку, лесапасадкі і інш.), пачала рэалізоўвацца праграма развіцця паляўнічай гаспадаркі.



Вольга Пралюк. Рагаты, вялікі, а не зубр...

Усё гэта дапамагло росту папуляцыі лася ў Беларусі. На пачатак 2018 года, паводле даных НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах, яна склала рэкордную колькасць — **больш за 36 тысяч асобін**!

У цяперашні час колькасць ласёў стабілізавалася. Яны засяляюць усе лясныя масівы краіны, але больш за ўсё гэтых жывёл у паўночнай, паўночна-усходняй і цэнтральнай частках. У Беларусі прасторавая структура рассялення гэтага віду ў напрамку з паўднёвага захаду на паўночны ўсход павялічваецца ў 4-4,5 разы, а на паўднёвы ўсход — у 3,5 разы.

### Сахаты прыгажун

Лось — самы буйны прадстаўнік сямейства Аленевыя. Даўжыня цела самцоў — 198-296 см, самак — 196-266 см, вышыня ў карку адпаведна 158-212 і 160-198. Маса цела самцоў — 132-520 кг, самак — 120-452 кг.

У самцоў добра развіты рогі. На першым годзе жыцця ў іх на галаве з'яўляюцца бугаркі, а на другім годзе ў канцы красавіка — пачатку мая пачынаюць расці рогі. Падчас іх росту (з мая па жнівень) звяры маюць патрэбу ў ежы, багатай кальцыем і фосфарам. Затым рогі "касцянеюць" — скура на іх скручваецца і лопаецца.

Першыя свае рогі лось носіць да сакавіка-красавіка наступнага года, а ў далейшым ён ужо штогод скідае іх у снежні, радзей — у студзені. Чым лепшы фізічны і фізіялагічны стан жывёлы, тым раней лось скідае рогі, і наадварот.



Фота Віктара КАЗЛОЎСКАГА

**ЦІКАВА ВЕДАЦЬ**

● **Чаму лася сахатым завуць?** Гэтым эпітэтам жывёлу "ўзнагародзілі" за тое, што рогі самца падобныя да старажытнай прылады працы — сахі.

● **Чаму лось скідае рогі?** Яны адпадаюць па прычыне змяншэння колькасці палавых гармонаў у крыві самца пасля заканчэння шлюбнага перыяду. Гарманальныя змены прыводзяць да размякчэння касцявога рэчыва ў месцы мацавання рогаў да чэрапа. Скінутыя рогі ўтрымліваюць шмат бялку і з'яўляюцца ежай для грызуноў і птушак.



**Сляды лася.**



У Беларусі самы буйны лось (самец) быў здабыты ў 1985 годзе на тэрыторыі Нараўлянскага раёна. Вага яго складала 507 кг!

### Любяць чарніцы і жывуць групамі

Лось непатрабавальны да ежы, але ў суткі яму неабходна 12-15 кг корму (дарослы самец з'ядае 12,5-16 кг, дарослая самка — 7,8-12, сяголетак — 5,7-8 кг галінак). У зімовых умовах задаволіць патрэбнасць жывёлы ў харчаванні лепш за іншыя пароды можа сасна. У цэлым, рацыён лася змяняецца ў залежнасці ад пары года. Летам (май-ліпень) ён спажывае шмат травы, з кустоў — маліны, брусніцы, чарніцы, буякі, багун. Зімою ж есць парасткі і кару ліставых дрэў, але ўсё ж пераважаюць парасткі сасны, а таксама елкі. У другой палове зімы жывёлы часта пераходзяць у сасновы маладняк, дзе могуць наносіць сур'ёзны ўрон.

Вялікіх статкаў гэтыя лясныя волаты не ўтвараюць, жывуць групамі па 3-5 асобін. Але там, дзе іх колькасць высокая, групы могуць быць буйнейшымі — па 10-15 асобін. Звычайна статак складаецца з адной або некалькіх кароў і цялятаў рознага ўзросту. Часцей за ўсё ў такой групе ласі праводзяць познюю восень і зіму. Пасля шлюбнага перыяду да самца і самкі далучаюцца сяголетак або двое, а нярэдка і маладыя ласі мінулага году — так фармуецца група, якая трымаецца да вясны, гэта значыць да з'яўлення наступнага патомства.

Цяжарнасць самак працягваецца каля 8,5 месяцаў, а цяляты з'яўляюцца на свет у маі — пачатку чэрвеня. Ва ўзросце 1,5-2 месяцаў ласяняты пачынаюць харчавацца расліннай ежай, а ў тры месяцы цалкам пераходзяць на гэты корм. Растуць яны хутка і да восені дасягаюць вагі 100 кг, а ў 6-7 месяцаў важаць ужо 140-160 кг!

### Новыя тэрыторыі

Сёння назіраецца не толькі павелічэнне папуляцыі лася, але і пашырэнне яе арэалу. Навуковы супрацоўнік дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання "Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук ➤

Беларусі па біярэсурсах" Павел Велігураў распавёў, што лось, які з'яўляецца тыповым відам тайговых лясоў (а гэта толькі поўнач краіны, Віцебская вобласць, дзе і пражывала большасць сахатых), усё актыўней асвойвае іншыя тэрыторыі. Павел Аляксандравіч дзеліцца назіраннямі:

— Дзіўна тое, што ласю ўдалося пасяліцца ў Прыпяцкім і Прыбужскім Палессі. У адрозненне ад паўночнай групоўкі, якая пражывае ў звыклых для віду ўмовах, паўднёвая стала нечаканасцю для навукоўцаў. Гэты рэгіён характарызуецца высокімі тэмпературамі летам, павышанай вільготнасцю, што павінна дрэнна адбівацца на паўночных жывёлах. Разам з тым, цяпер на Палессі ідзе актыўнае зарастанне хмызнякамі балотаў, сельскагаспадарчыя палі не заўсёды апрацоўваюцца, а мясцовае насельніцтва выкарыстоўвае не ўсе сенажаці. Гэтыя фактары прыводзяць да закустарвання, а кустоўе, галінкі — добрая ежа для лася.

Аляксандр Казарэз, начальнік аддзела паляўнічай гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі, тлумачыць пашырэнне арэала паляпшэннем экасістэм Палесся:

— Не забывайцеся, што раней лось засяляў усю тэрыторыю Беларусі. А паколькі сёння ў гэтым рэгіёне аднаўляюцца балоты, стабілізуецца іх водны рэжым, то гэтыя тэрыторыі зноў становяцца прыдатнымі для яго пражывання. Ласі ёсць там, дзе ёсць вада.




**Шчыльнасць рассялення лася ў разрэзе адміністрацыйных раёнаў Беларусі (2018 г.).**

Павел Велігураў вылучае тры асноўныя фактары, якія дазволілі вырасці папуляцыі лася. Першы — павелічэнне кармавой базы (закустарванне адкрытых месцаў пражывання). Другі — інтэнсіўнае паляванне на ваўка. Згодна з правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, паляўнічы мае права здабываць ваўка (як і лісу) падчас любога законнага знаходжання ў паляўнічых угоддзях (можа адстрэльваць ваўка, нават калі гэта не напісана ў яго паляўнічай пуцёўцы). Трэці фактар — сучасныя меры аховы жывёлы.

**Вольга ПРАЛЮК**

## ФАКТЫ І ЛІЧБЫ

- Нягледзячы на сваю непераборлівасць, лось не спажывае сена.
- У сталых самак часта нараджаюцца двайняты.
- Нованароджанае ласяня важыць 14-16 кг.
- У Беларусі лось жыве не больш за 18-20 гадоў. У Еўропе былі зарэгістраваныя асобіны 25-гадовага ўзросту.
- У нашай краіне натуральным ворагам лася з'яўляецца толькі воўк.



Фота Віктара ЯРАШУКА

**Пасля заканчэння распрацоўкі пясчаных і іншых кар'ераў іх звычайна рэкультывуюць. Гэтыя месцы выраўноўваюцца, там часта высаджваюць сасну, якая даволі непатрабавальная да глебы, расце і на пясках. Лось выкарыстоўвае ў ежу сасновы маладняк, кусты, галінкі.**